# Тэатралізаваная пастаноўка “Калядкі”

**Анастасія Андрэеўна:** Каляды-гэта народнае зімовае свята дахрысціянскага паходжання. У гадавым крузе народных абрадаў і святкаванняў мінулага яны храналагічна займалі першае месца. Назва іх паходзіць ад лацінскага слова "календы". Так старажытныя рымляне называлі першы дзень кожнага месяца.

Усе календы святкаваліся, але асабліва ўрачыста адзначалі навагоднія.

Ва ўсходнеславянскіх народаў Каляды адзначаліся з 24 снежня па 6 студзеня ўключна. На працягу гэтых двух тыдняў працаваць лічылася грэхам і людзі ў дзень выконвалі толькі тую работу, без якой нельга было абысціся. Ва ўсе вечары нічога не рабілася, а таму называлі іх святымі.

Рыхтавацца да каляд сяляне пачыналі ўжо з Піліпашкі. Да свята кожная сям'я старалася забяспечыць сябе патрэбнымі прадуктамі харчавання, забівалі свінню, для жывелы нарыхтоўвалі неабходную колькасць кармоў.

У многіх вёсках Беларусі Калядамі называлі толькі само свята з 25 па 28 снежня, а перыяд з 24 снежня па 6 студзення -калядаўніцамі. У некаторых славян Калядою ўласна называлі тры дні: дзень перад так званым нараджэннем Хрыста, дзень перад Новым годам і дзень перад вадохрышчам .

У кожнага народа Каляды праводзіліся весела. Лічылася, што калі весела сустрэць пачатак Новага года, то увесь год будзе вясёлым і шчаслівым.

На Беларусі вячэра 24 снежня насіла агульную назву 'куцця', таму ў гэты дзень абавязкова варылася куцця. Першая куцця служыла пачаткам Каляд і спраўлялася з вялікай урачыстасцю, а таму і атрымала назву вялікай куцці. За стол садзіліся як толькі на небе з'яўлялася першая зорка. На працягу усіх калядных дзен спраўляліся тры куцці.

З першай было звязана у народзе много прыкмет, звычаяў, варожбаў. Так падсохлы верх куцці за вячэрай здымалі і аддавалі курам, каб добра яйкі неслі. Зачэрпнуўшы першую лыжку куцці,гаспадар стукаў у акно і клікаў мароз куццю есці , каб не марозіў пасевы ячменю, пшаніцы, гароху, грэчкі,а гаспадыня зазывала мароз на куццю, каб не марозіў на агародзе рассаду, гуркі , гарбузы і інш.

**Сцэна:**

*Звычайная беларуская каша, стол, лаўкі, унізе, на падлозе чыгун з кашай, які стаіць у сене. У пакоі дзед і баба, з імі іх унучка.*

*Баба збірае на вячэру.*

**Баба.** *(седзячы за сталом)* Ці бачыш мяне дзед?

**Дзед.** Не бачу!

**Баба.** Каб жа ты не бачыў за стагамі.

**Дзед.**А ці бачыш ты мяне?

**Баба.**Не бачу!

**Дзед.**Каб жа ты не бачыла за гуркамі,за гарбузамі, за капустаю,за буракамі свету!

*Баба.(замахваецца чарпаком, махае)*

**Дзед.**Каб тvае снапы так хутка падалі на ніве!
*(Пасля баба пачынае з-пад абруса даставаць сянінкі і прыгаворваць):*
**Баба.**Зараз я,мае вы даражэнькія,павараджу,ці будзе у нас у гэтым годзе добры лен.
*(Пачынае выцягваць з-пад абруса сянінкі)*
**Баба.**Во,глядзіце,якая вялікая сянінка выцягваецца,будзе добры у нас лен,вялікі.
**Дзед.**Дзякуй богу!
**Унучка.**Бабулька,я зараз прынясу куццю,паглядзіце, ці будзе добры ўраджай ячменю.(*Усе глядзяць куццю.)*
**Дзед.**О,дзякуй богу!Будзе добры ячмень,во якая густая!
**Усе разам:**ды мусіць і смачная!
**Баба.**Паглядзі ўнучка ў акно, ці есць на небе зоркі, ці многа іх?
**Унучка.***(глядзіць у акно).*Ой,бабулька і дзядулька, неба ўсе ўсыпана зоркамі.
**Дзед.**От добра, гэта азначае, што летам будзе вельмі многа грыбоў.
**Баба.**А вось, калі з поўдня пасыплецца град, то будзе ўмалотны гарох.
**Дзед**.Акалі будзе ісці густы снег- дык будуць раіцца пчолы, а есць пчолы - дык будзе многа меду.
*(Усе садзяцца вячэраць).*
**Дзед.**Ты ж баба, сёння не мый лыжак , а звяжы іх суконнай ніткай і пакінь на стале, каб авечкі не адбіваліся ад дому.
**Баба.**Ты ж дзед, занясі ў хлеў сена, што ляжыць на куце,на якім стаяў чыгун з куццею і дай карове і авечкам, ды не забудзь сыпнуць снегу ў вочы свінням, каб не лазілі у шкоду. (*Дзед бярэ сена і выходзіць.)*
**Баба.**Унучка, пачытай мне, калі ласка, тую кніжку, дзе пішацца пра каляды.
**Унучка.**Бабка, гэта кніжка называецца "Новая зямля", а напісаў яе Якуб Колас.

**Чытае.**

***На першы дзень святых калядак-)***
***Такі ужо быў святы парадак-***
***Збіралі сена са стала,***
***Кармілі ім каня,вала***
***І ўсіх жывелін,хоць па жмені,***
***А на стале ў драбнюткім сене-***
***Здавен-дауна вялося гэта***
***Уважна зернетак шукалі***
***І па тых зернетках гадалі,***
***Які зародзіць хлеб на лета***

*(Уваходзіць дзед)*
**Дзед.**О, унучка чытае нашы любімыя вершы, малайчына. Эй, бабка, давай арэшкі ды гарбузікі, сення каляды, будзем ласавацца.
**Бабка.**О,зараз знайду, прынясу!
*(Прыносіць гарбузікі, арэхі, пачынаюць жартаваць).*
***З дзвярэй актавага зала чуваць жарты,песні.***

**Бабка.**Вай, чуеце, што на вуліцы музыка грае, напэўна казу вядуць.
*Унучка з дзедам углядаюцца.*
**Унучка.**Бабка так, так "казу" водзяць, вунь і да нас заварочваюць ў двор.
**Бабка.**Вай, вай, да нас ідуць.
*Сыходзяць са сцэны, грае калядная музыка **(Плюс)***
**Дзед.**Заходзьце, калі ласка.
*Калядоўшчыкі спыняюцца збоку, каля дрэва*
**Павадыр.**Каляды, калядачкі, бліны ды аладачкі.
Ой, люлі, люлі, бліны ды аладачкі.
Пытаў дзедка ў бабкі:
"Ці скора, бабка, калядкі?"
**Бабка.**Ты калядак не пытайся, ты к калядкам сабірайся.
А калядкі ў бярэзнічку, а каўбаскі ў жалезнічку.
**Павадыр.**Сення каляды ,усе людзі рады.
Пручка смаляць і бога хваляць.
Радуйся зямля, бо жыта родзіць.
Прыехала каледка, прыехала лябедка
На сівым казлятку.
**Дзед.**Адкуль вы?
**Павадыр.** Мы людзі не простыя, з далекага краю,
Хлопцы ўсе сталыя з-пад самага раю.
**Баба.**Адкуль ідзеце?
**Павадыр.**Ідзем кругам,светам аж ,ад пана лета.
Мы к лету ідзем, казу вядзем і радасць нясем.
**Дзед ,баба ,унучка.**Дык просім да нас!!!*( калядоўшчыкі праходзяць бліжэй да сярэдзіны зала)*
**Павадыр.** Ну, ну-ну ,каза,
Ну ,ну-ну, нябожая,
Не адбрыквайся
Паварачвайся
То на сей бачок,
То на той бачок,
Ды расхадзіся, развесяліся.
*(Каза танцуе, музыка калядная,**Плюс**)*
**Павадыр.** Па ўсяму дому,
Па гаспадарскаму.
Дзе каза ходзіць,
Там жыта родзіць,
Дзе не бывае ,там вылягае...
*(Каза танцуе ,кідаецца ,прыкідваецца мертвай ,потым падымаецца і кланяецца гаспадарам).*

**Механоша.**Уставай, каза,
Жылы надзімай,
Гаспадар ідзе,
Каляду нясе:
Рэшата аўса,
Наверх каўбаса.

**Павадыр.** Ой, мая каза зусім прытамілася, трэба ей крыху адпачыць. А вас павесяляць мае дружкі.

***(прыпеўкі-жарты)***

**Мядзведзь.**Ты, музыка, нам іграй,
Танцаваць не замінай.
Ногі самі рвуцца ў пляс,
Бо прыпевачкі у нас.

**Цыганка 1.**Мы з сяброўкай ростам роўны
Вочкі, як смуродзінкі.
Пра любоў мы ні гаворым,
Бы яшчэ малодзенькі!

**Мядзведзь.**Мне ні трэба пуд гароху,
А адну гарошыну.
Мне ні трэба многа дзевак,
А адну харошую!

**Механоша**.Мама чаю, мама чаю
З галубога чайніка.
Ні пайду я за прастога
А пайду я за начальніка!

**Цыганка 1.**Мы прыпевачкі канчаем
І вас просім ні тужыць,
Пакуль песні мы спяваем,
Усе добра будзем жыць.

*Проста словы*

**Павадыр:**Калядзін, калядзін,
Я ў бацькі адзін,
Кароценькі кажушок.
Дайце мне піражок.
А наверх каўбасу,
А то хату разнясу.

**Цыганка 2**:Шчадрую шчадрую
Каўбасу чую.
Дайце каўбасу,
Дамоў панясу.
**Цыганка 1.**Дайце другую,
Толькі даўгую.
Дайце трэцюю-
Хоць авечую.

*(Ідуць па залу з карзінай, першым--настаўнік нашай школы).*

**Павадыр.**Пакідаючы хату. Будзь здароў ,як рыжы бароў,
Май торбу грошаў ,жыві ў раскошы.

**Каза.**Майце ўсяго даволі, а бяды ніколі
Стары год канчаем, а новы зачынаем.
З ранняю вясною, з буйнаю травою,
З збожжам каласістым ,з зернем ядраністым.
Ды спрытным летам, і з громам пры гэтым.
І з восенню яснай ,і з долечкай шчаснай.

**Усе разам.** А вы здаровы бывайце ,за год нас чакайце.

*Іграе музыка ,цыган, маладзіца з імі "каза" танцуюцць, спяваюць, выходзяць з хаты.*

***Выходзіць Анастасія Андрэеўна, перад сцэнай, пакуль яна гаворыць, прымаецца стол на сцэне, рыхтуецца танец***

**Анастасія Андрэеўна.** Такім чынам, як і ў мінулым, так і сення, народныя святы застаюцца важнейшым сродкам фарміравання і станаўлення грамадзянскасці чалавека.

Людзям як паветра неабходны і святочныя ўрачыстасці, якія маюць свае гістарычныя карані, памятныя даты, традыцыйныя высновы і абрадавыя цырымоніі.

Вопыт людзей усяго чалавецтва ў мінулым данес нашчадкам найбагацейшую палітру розных святаў і абрадаў. Сярод іх народнае зімовае свята Каляды.